«Разам – для птушак і людзей»

ПАД ТАКІМ ДЭВІЗАМ БОЛЬШ ЯК ДЗЕСЯЦЬ ГАДОЎ АЖЫЦЦЯЎЛЯЕ СВАЕ ІДЭІ ГРАМАДСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ "АХОВА ПТУШАК БАЦЬКАЎШЧЫНЫ"

На рахунку гэтай грамадскай арганізацыі нямала рэалізаваных праектаў, накіраваных на захаванне рэдкіх відаў птушак і месцаў іх гнездавання. Гэта грамадская арганізацыя з'яўляецца афіцыйным беларускім прадстаўніком міжнароднай прыродаахоўнай асацыяцыі BirdLife International, якая мае партнёраў больш як у 100 краінах свету. "Ахова птушак Бацькаўшчыны" ў цяперашнім яе выглядзе з'явілася ў 1998 годзе. За дзесяцігадовую гісторыю супрацоўніцтва з BirdLife International "Ахова птушак Бацькаўшчыны" вырасла ў прафесійную экалагічную арганізацыю, якая сабрала пад сваім "крылом" больш за дзве тысячы членаў. Цяпер у яе ўваходзіць 13 раённых аддзяленняў, звыш 100 школьных клубаў "Крылаты дазор".

— З моманту стварэння арганізацыі на захаванне біяразнастайнасці ў Беларусі — менавіта гэта і з'яўляецца нашай асноўнай мэтай — прыцяінута звыш 5 мільёнаў долараў, — адзначыў дырэктар арганізацыі "Ахова птушак Бацькаўшчыны" Віктар Фянчук. — Гэта поспехі, якімі можна ганарыцца, але на якіх, безумоўна, не трэба спыняцца. Усе дасягненні сталі магчымыя толькі дзякуючы цеснаму супрацоўніцтву арганізацыі са структурамі Міністэрства прыродных рэсупсаў, Міністэрства лясной гаспадаркі, Міністэрства адукацыі, мясцовымі ўладамі, акадэмічнымі інстытутамі.

Паводле слоў генеральнага дырэктара Навукова-практычнага цэнтра па біярэсурсах Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Міхаіла Нікіфарава, сёння згадванне ў сродках масавай інфармацыі аб "Ахове птушак Бацькаўшчыны" — гэта не нататкі пра нейкіх дзівакоў-натуралістаў або пра забаўныя акцыі дапытлівых аматараў прыроды. Як правіла, гэта важкае меркаванне спецыялістаў, экспертаў і кансультантаў па тых або іншых пытаннях экалогіі, аховы жывёльнага свету і асяроддзя пражывання.

Усю работу арганізацыі "Ахова птушак Бацькаўшчыны" можна ўмоўна падзяліць на два вялікія блокі. Першы — непасрэдна прыродаахоўныя праекты, накіраваныя на вывучэнне і захаванне каштоўных прыродных тэрыторый і рэдкіх відаў птушак. Другі — эколага-асветніцкая дзейнасць, у рамках якой праводзяцца шматлікія кампаніі і акцыі, выпускаюцца інфармацыйны бюлетэнь і ілюстраваны часопіс "Птушкі і мы", разнастайныя плакаты, буклеты, іншыя інфармацыйныя матэрыялы.

Да найбольш вядомых і масавых акцый арганізацыі "Ахова птушак Бацькаўшчыны", мэтай якіх з'яўляецца папулярызацыя назіранняў за птушкамі і фарміраванне ў беларусаў беражлівага стаўлення да прыроды, варта аднесці восеньскія назіранні за птушкамі і зімовын ўлікі птушак. Другі год у Беларусі праходзіць акцыя "Салаўіныя ночы". У выніку падліку салаўёў былі падрыхтаваны унікальныя "салаўіныя" карты Мінска і некаторых іншых гарадоў.

Трэці год арганізацыя "Ахова птушак Бацькаўшчыны" каардынуе ў Беларусі і агульнаеўрапейскую кампанію "Жывая вясна". А кампанія "Птушка года" па сваём масавасці і папулярнасці з'яўляецца ўжо сапраўды нацыянальнай. На конкурсы дзіцячых малюнкаў і казак прыходзяць сотні работ. Штогод прадпрыемства "Белпошта" выпускае маркі, прысвечаныя птушцы года, а Нацыянальны банк — памятныя манеты.

Сярод іншых найбольш значных прыродаахоўных праектаў арганізацыі "Ахова птушак Бацькаўшчыны" — распрацоўка і рэалізацыя планаў кіравання буйнейшымі нізіннымі балотамі Палесся, якія з'яўляюцца месцам гнездавання вяртлявай чарацянкі (менавіта гэтая рэдкая птушка намалявана на лагатьше арганізацыі). Штогод "Ахова птушак Бацькаўшчыны" арганізуе палявыя лагеры па захаванні унікальнага балотнага комплексу рэспубліканскага заказніка "Ельня". Пад асаблівай апекай аказаўся і Тураўскі луг — гэта вельмі каштоўная для захавакня разнастайнасці птушак і, у

прыватнасці, кулікоў тэрыторыя перададзена арганізацыі "Ахова птушак Бацькаўшчыны" ў доўгатэрміновую арэнду. Прычым у гісторыі Беларусі гэта першы выпадак арэнды для прыродаахоўных мэт.

Источник: Беларусь.-2010.-№1.-С.105.